*Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

# Работніца і калгасніца Беларусі

№ 1

# УКАЗ

## Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

## АБ ПРЫСВАЕННІ ТАВАРЫШУ ІОСІФУ ВІСАРЫЁНАВІЧУ СТАЛІНУ ЗВАННЯ ГЕРОЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

За выключныя заслугі ў справе арганізацыі большэвіцкай партыі, стварэння совецкай дзяржавы, пабудовы соцыялістычнага грамадства ў СССР і ўмацавання дружбы паміж народамі Совецкага Саюза—прысвоіць таварышу Іосіфу Вісарыёнавічу **Сталіну**, у дзень яго шасцідзесяцігоддзя,—званне **героя Соцыялістычнай Працы** з уручэннем вышэйшай узнагароды СССР—**ордэна Леніна.**

*Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.*

*Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН*

Масква, Крэмль.
20 снежня 1939 г.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. СТУДЗЕНЬ 1940 г. № 1.

3ок
1844

# Вялікаму прадаўжальніку справы Леніна— таварышу Сталіну

**Дарагі друг і баявы таварыш!**

Цэнтральны камітэт большэвіцкай партыі горача вітае цябе, друга Леніна і вялікага прадаўжальніка яго справы, правадыра партыі і совецкага народа—у дзень твайго шасцідзесяцігоддзя.

Больш 40 год ты служыш справе пролетарскай рэволюцыі, справе рабочага класа і ўсяго працоўнага народа. Ты быў вярнейшым саратнікам Леніна ў яго барацьбе за партыю, за дыктатуру пролетарыята. Разам з Леніным многія годы ты будаваў і выкоўваў магутную большэвіцкую партыю. Разам з Леніным ты вёў партыю і рабочы клас на ўзброенае паўстанне ў кастрычніку 1917 года. Як бліжэйшы памочнік Леніна, ты непасрэдна кіраваў усёй справай падрыхтоўкі Кастрычніцкага паўстання і паспяховым заваяваннем улады рабочым класам.

У годы айчыннай грамадзянскай вайны супроць замежных захватчыкаў і буржуазна-памешчыцкай белагвардзейшчыны ты, таварыш Сталін, пад кіраўніцтвам Леніна быў непасрэдным натхніцелем і арганізатарам перамог Чырвонай Арміі на ўсіх франтах, дзе вырашаўся лёс рэволюцыі.

Пасля смерці Леніна партыя большэвікоў пад тваім мудрым кіраўніцтвам, пераадалеўшы велізарныя цяжкасці на сваім шляху, прывяла нашу краіну да перамогі соцыялізма.

Прэзрэнныя ворагі народа трацкісты, зіноўеўцы, бухарынцы хацелі адняць у рабочага класа, у совецкага народа веру ў магчымасць перамогі соцыялізма ў нашай краіне, неаднаразова прабавалі падарваць партыю знутры, разбіць адзінства большэвіцкай партыі, пагубіць совецкую ўладу і соцыялістычную рэволюцыю. Ва ўпорнай прынцыповай барацьбе з ворагамі соцыялізма, ворагамі партыі, пад тваім кіраўніцтвам у барацьбе за ленінізм згуртаваўся Цэнтральны Камітэт і ўся наша партыя. Ты адстаяў ленінскую тэорыю магчымасці перамогі соцыялізма ў адной краіне, развіў гэтую вялікую тэорыю далей, узброіў ёю партыю і мільённыя масы працоўных Совецкага Саюза—гэта забяспечыла выкрыццё і разгром ворагаў рэволюцыі.

Пад тваім кіраўніцтвам партыя большэвікоў ажыццявіла соцыялістычную індустрыялізацыю краіны, стварыла новыя індустрыяльныя ачагі і раёны, першакласныя заводы цяжкай і лёгкай індустрыі, магутныя заводы машынабудаўніцтва, што забяспечыла тэхнічную рэканструкцыю ўсёй народнай гаспадаркі і ўзбраенне навейшымі сродкамі абароны СССР. Пад тваім кіраўніцтвам партыя зрабіла такі найглыбейшы рэволюцыйны пераварот у вёсцы, як суцэльная калектывізацыя і ліквідацыя кулацтва як класа, забяспечыўшы на аснове перамогі калгаснага ладу культурнае і заможнае жыццё многамільённага сялянства. Наша краіна стала магутнай індустрыяльнай дзяржавай, краінай буйнага калектыўнага земляробства, краінай перамогшага соцыялізма.

На аснове гэтых поспехаў ідзе быстры ўздым культуры народаў Совецкага Саюза. Створана совецкая інтэлігенцыя, адданая совецкай уладзе, справе соцыялізма.

Партыя і совецкая ўлада пад тваім кіраўніцтвам стварылі ўзброеную першакласнай тэхнікай магутную і непераможную Чырвоную Армію, якая з'яўляецца надзейнай абаронай нашай радзімы ад усіх знешніх ворагаў.

Рабочы клас у саюзе з сялянствам, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, знішчыў назаўсёды эксплуатацыю чалавека чалавекам і ўцвердзіў новы, соцыялістычны лад у СССР, які не ведае ні крызісаў, ні беспрацоўя, які забяспечвае няўхільны ўздым матэрыяльнага добрабыту і культурнага ўзроўню працоўных. Гэты галоўны вынік нашай барацьбы мае сусветна-гістарычнае значэнне, ён умацоўвае ў працоўных усяго свету веру ў таржаство соцыялізма.

Наша партыя пад тваім выключна актыўным і непасрэдным кіраўніцтвам стварыла магутную многанацыянальную совецкую дзяржаву, умацавала вялікую і непарушную дружбу народаў СССР, залог іх працвітання і непераможнасці. Новая канстытуцыя СССР, Канстытуцыя перамогшага соцыялізма і разгорнутай соцыялістычнай дэмакратыі, па справядлівасці названа народам Сталінскай Канстытуцыяй.

Таксама, як і Ленін, ты, таварыш Сталін, заўсёды надаваў і надаеш найвялікшае значэнне развіццю і прапагандзе рэволюцыйнай тэорыі. Твае класічныя тэарэтычныя работы, стаўшыя здабыткам мільёнаў людзей у нашай краіне і ва ўсім свеце, з'яўляюцца далейшым развіццём марксізма-ленінізма ў новых умовах эпохі імперыялізма і пролетарскай рэволюцыі, эпохі перамогі соцыялізма на адной шостай частцы зямлі. Ты развіў марксісцка-ленінскую тэорыю дзяржавы, распрацаваўшы вучэнне аб соцыялістычнай дзяржаве ва ўмовах капіталістычнага акружэння. Узбройваючы партыю марксізмам-ленінізмам, ты нястомна згуртоўваў яе арганізацыйна. На гэтай аснове ажыццёўлена сталінскае адзінства нашай партыі.

Адным з выдатных поспехаў большэвіцкай партыі, дасягнутых дзякуючы тваім клопатам і кіраўніцтву, з'яўляецца быстры рост кадраў, вылучэнне многіх тысяч новых работнікаў соцыялістычнага будаўніцтва і абароны краіны соцыялізма.

Аддаючы ўсе свае сілы вялікаму служэнню народу,—ты, таварыш Сталін, таксама як і Ленін, любіш свой народ і неаддзялім ад народа. Таксама як і Ленін, ты акружан гарачай любоўю працоўных Совецкага Саюза і ўсяго свету.

Сёння наша партыя і народы Совецкага Саюза, вітаючы цябе ў дзень шасцідзесяцігоддзя, згуртаваны як ніколі вакол свайго Цэнтральнага Камітэта пад сцягам Леніна—Сталіна і гатовы да далейшай барацьбы за поўную перамогу комунізма.

Няхай жыве непераможная партыя большэвікоў, партыя Леніна—Сталіна!

Жыві доўгія годы, наш родны Сталін, на радасць партыі, рабочага класа, народаў совецкай зямлі і ўсяго свету!

**Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў)**

20 снежня 1939 г.

Инв. 1953 г. БА 664

# Уперад да новых перамог!

З лікаваннем і радасцю 183-мільённы шчаслівы совецкі народ сустрэў новы 1940 год. Бадзёра і ўпэўнена народы краіны соцыялізма ўступілі ў яшчэ адзін выдатнейшы год—трэці год Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

1939 год знамянальны многімі бліскучымі перамогамі і падзеямі ў жыцці совецкага народа. У мінулым годзе, як і ва ўсе годы совецкай улады, Сталінскі Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі і совецкі ўрад вынес рад мудрых рашэнняў, якія былі поўнасцю накіраваны на яшчэ большае працвітанне нашай соцыялістычнай радзімы, на яшчэ большае ўмацаванне абароназдольнасці нашай краіны, на яшчэ больш радаснае і шчаслівае жыццё працоўных вялікага Совецкага Саюза.

Мінулы год незабываемы яшчэ і тым, што наша слаўная Чырвоная Армія па рашэнню совецкага ўрада ўпісала ў гісторыю новыя старонкі. Яна бліскуча выканала свой інтэрнацыянальны абавязак—вызваліла працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад прыгнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў. 17 верасня 1939 года астанецца вякамі ў памяці працоўных. Вялікі совецкі народ прыняў у сваю шчаслівую сям'ю народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія разам з намі будуюць квітнеючае радаснае жыццё.

Капіталістычны свет сустрэў новы год полымем распачаўшайся другой імперыялістычнай вайны. Мудрая палітыка партыі і совецкага ўрада не дала магчымасці англа-французскім агрэсарам уцягнуць Совецкі Саюз у гэту вайну. Прайшоўшы год быў годам умацавання дружбы Совецкага Саюза са сваімі суседзямі: Германіяй, Латвіяй, Літвой, Эстоніяй і іншымі краінамі.

Велізарнейшае значэнне мае заключэнне дагавора аб узаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам і дэмакратычнай Фінляндыяй. Наша доблесная Чырвоная Армія дапамагае фінляндскаму народу вызваліцца ад сваіх прыгнятальнікаў. Поспехі Чырвонай Арміі выклікаюць захапленне працоўных усяго свету.

З вялікай радасцю народы нашай рэспублікі, як і ўсе працоўныя Совецкага Саюза рыхтаваліся і правялі ўсенароднае свята—дзень выбараў у месныя Советы дэпутатаў працоўных. І на гэты раз рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя прадэманстравалі маральна-палітычнае адзінства совецкага народа, бязмежную адданасць партыі Леніна—Сталіна, любоў да радзімы. Яны галасавалі за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за дастойных сыноў і дачок нашай радзімы. Вынікі выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных з'яўляюцца ярчайшым пацверджаннем гэтага.

Толькі ў абласныя Советы Мінскай, Магілеўскай, Віцебскай, Гомельскай і Палескай абласцей 98,8 процантаў выбаршчыкаў галасавалі за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Многа жанчын нашай рэспублікі з'яўляюцца выбраннікамі народа. У абласныя Советы іх абрана 119, у раённыя—1419, у гарадскія—1073, у сельскія і пасялковыя—9873.

Сталінскі блок комуністаў і беспартыйных атрымаў яшчэ адну выдатную перамогу. Ды інакш і быць не можа. Совецкі народ бязмежна любіць і давяраю комуністычную партыю і вялікага Сталіна. Інтарэсы большэвіцкай партыі—гэта інтарэсы народа. Наша партыя неаддзяліма ад народа, як неаддзялім народ ад партыі. Сталін, партыя і народ складаюць адно цэлае. Вось чаму народы з вялікім натхненнем галасавалі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Працоўныя БССР асабліва горды і шчаслівы. Яны ўдастоіліся вялікай чэсці. Наш любімы бацька, лепшы друг беларускага народа Іосіф Вісарыёнавіч Сталін і яго бліжэйшыя саратнікі—глава совецкага ўрада Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў і жалезны Нарком Абароны Клімент Ефрэмавіч Варашылаў абраны дэпутатамі ў Мінскі гарадскі Совет.

За мінулы год мы дабіліся ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва велізарных поспехаў.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка, якая праводзілася ў горадзе Маскве ў 1939 годзе была грандыёзным паказам перамогі соцыялістычнай сельскай гаспадаркі ў нашай краіне.

Сотні жанчын Совецкай Беларусі мелі вялікі гонар быць удзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Імёны многіх красаваліся на стэндах беларускага павільёна. Каб удастоіцца права быць удзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў 1940 годзе нашы калгасніцы павінны рыхтавацца да яе зараз-жа. Трэба дабіваць высокіх сталінскіх ураджаеў. Выконваць планы па развіццю жывёлагадоўлі.

28 снежня споўніўся год з дня апублікавання гістарычнага дакумента ЦК ВКП(б), СНК СССР і ВЦСПС «Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, палепшанню практыкі дзяржаўнага соцыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе». Падводзячы вынікі выканання рашэнняў партыі і ўрада па гэтаму пытанню можна з упэўненасцю сказаць, што пастанова ЦК партыі і Соўнаркома СССР дала магчымасць устанавіць сапраўдны большэвіцкі парадак на прадпрыемствах, заводах, фабрыках і ўстановах.

Рабочыя, работніцы і інтэлігенцыя, уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, свае соцыялістычныя абавязацельствы з чэсцю выконваюць. Аб гэтым сведчыць факт разгортвання руху многастаночнікаў, пераключэнне на авалодванне некалькімі прафесіямі. Усё гэта дало магчымасць поўнасцю забяспечыць выкананне грандыёзных планаў другога года Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

Дасягненні нашы безумоўна велізарныя. Аднак нельга на гэтым заспакойвацца. Мы павінны дабіцца большых поспехаў. Трэба яшчэ вышэй узняць прадукцыйнасць працы, усямерна дабівацца зніжэння сабекошту выпускаемай прадукцыі. Прадукцыя Совецкага Саюза павінна быць лепшай у свеце.

Можна з упэўненасцю ска[illegible] нчыны Беларускай Рэспублікі—рабо[illegible] сніцы, інтэлігенткі, як і ўвесь со[illegible] устаючы ў 1940 год будуць і н[illegible] ца за выкананне задач, пастаўл[illegible] ычным XVIII з'ездам большэвіцкай п[illegible]

З новым годам, таварышы! яшчэ больших перамог!

М. Ф. ЦЯЛАВА—Намеснік Наркома лёгкай прамысловасці БССР

# Гістарычныя рашэнні ў дзеянні

28 снежня 1939 года споўнілася гадавіна з дня гістарычнага рашэння СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС «Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, палепшанню практыкі дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе».

У адказ на гэта важнейшае рашэнне партыі і ўрада рабочыя калектывы прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці БССР уключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

Небывалы вытворчы ўздым рабочых і работніц на заводах і фабрыках сведчыць аб новым у стаханаўскім руху—многастаночнае абслугоўванне, сумяшчэнне прафесій, авалодванне жанчынамі прафесій, дзе раней працавалі толькі мужчыны і інш. Усё гэта рэзультат гістарычнага рашэння партыі і ўрада аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны.

За 11 месяцаў і 20 дзён выканалі і перавыканалі свой гадавы план многія прадпрыемствы лёгкай прамысловасці БССР. Так, скураная прамысловасць выканала гадовы план за гэты перыяд на 104 проц., у тым ліку Мінскі скурзавод «Большэвік» на 106,7 процанта, Магілеўскі скурзавод імені Сталіна на 107 процантаў, Барысаўскі скурзавод на 103,4 процанта.

Па швейнай прамысловасці датэрмінова выканалі гадовы план Мінская фабрыка «Кастрычнік» 101,3 проц., імені Крупскай—109,8 проц., «8 сакавіка»—102,7 проц., фабрыка «КІМ»—107 проц. і другія.

Множацца рады стаханаўцаў лёгкай прамысловасці БССР. Кожная фабрыка, кожны завод мае сваіх перадавікоў, якія перавыконваюць нормы ў два і больш разоў. Па швейнай прамысловасці стаханаўцаў, якія выконваюць звыш двух норм—227 чалавек, скурабутковай прамысловасці—152 чалавека, шчаціна-шчотачнай прамысловасці—135 чалавек і г. д.

Толькі па Мінскіх фабрыках налічваецца каля 400 рабочых, якія авалодалі некалькімі працэсамі і сумяшчаюць некалькі аперацый. Так, па фабрыцы «Кастрычнік» тав. Ладуцька, працуючы на спецмашыне, сумяшчае тры аперацыі і выконвае план на 278 процантаў, т. Лабада сумяшчае пяць ручных аперацый і выконвае норму на 237 процантаў, тт. Одэрзух і Дзінерштэйн на прасоўцы сумяшчаюць па 4 працэсы і выконваюць норму на 250 процантаў. На фабрыцы імені Крупскай на машыннай рабоце Іванова, Врублеўская, Перэльман і Сушчынская сумяшчаюць некалькі аперацый і выконваюць норму выпрацоўкі звыш чым на 200 процантаў. На Мінскай шчотачнай фабрыцы імені Крупскай перайшлі на двухстаночнае абслугоўванне 8 работніц. На Гомельскай панчошна-трыкатажнай фабрыцы «8 сакавіка» работніцы з чатырох трыкатажных машын перайшлі на абслугоўванне шасці машын і па мацальнаму цэху—з 16 на 24 верацяна.

Усе гэтыя людзі перадавых соцыялістычных метадаў работы навучаюць новых рабочых комуністычным адносінам да працы, умацоўваюць працоўную дысцыпліну на прадпрыемстве і дапамагаюць весці рашучую барацьбу з парушальнікамі дысцыпліны і сімулянтамі, якія імкнуцца залазіць у дзяржаўную кішэню і нажыцца на гэтым.

Пытанне арганізацыі табельнага ўліку і пастаноўка на належную вышыню гаспадаркі працоўных кніжак у справе ўпарадкавання працоўнай дысцыпліны мае вялікае значэнне. Да гэтага пытання на большасці прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці падышлі сур'ёзна.

На абутковай фабрыцы імені Кагановіча акрамя пастаноўкі табельнага ўліку прыходу і ўходу з работы ў цэхах здавальняюча пастаўлена гаспадарка працоўных кніжак. Працоўныя кніжкі захоўваюцца ва ўзорным парадку ў спецыяльнай шафе. Асабліва заслугоўвае ўвагі для перадачы вопыта наяўнасць у аддзеле кадраў кнігі — дублікатаў працоўных кніжак, па якой пры згубе працоўнай кніжкі можна аднавіць усе даныя. Таксама ва ўзорным парадку знаходзяцца працоўныя кніжкі на скурзаводзе «Большэвік», швейнай фабрыцы «Кастрычнік».

Нельга адмаўляць і таго, што маюцца прадпрыемствы, кіраўніцтва якіх не вяло дастатковай палітыка-выхаваўчай работы па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны. І іменна там, дзе палітмасавая работа не праводзілася, там працоўная дысцыпліна знаходзіцца на нізкім узроўні. Там мае месца рост прагулаў, недахоп рабочай сілы і невыкананне плана.

Да ліку такіх кіраўнікоў можна аднесці былога дырэктара Мінскай валяльна-войлачнай фабрыкі тав. Гасілоўскага, які не праводзіў ніякай работы па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны на прадпрыемстве, а наадварот меў месца выпадак, калі з дазволу Гасілоўскага прагульшчыца Прохарава была прынята на работу і толькі пасля ўмяшання пракуратуры Варашылаўскага раёна і Наркамата апошняя была знята з работы.

Табельны ўлік тут знаходзіўся на нізкім узроўні. Рапарцічак аб спазніўшыхся на работу дырэктару табельшчык не даваў. За 9 месяцаў за прагулы і спазненні зволена 175 чалавек.

Падводзячы вынікі гадавой работы 1939 года неабходна памятаць, што поспех 3 года Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі будзе залежаць ад умацавання працоўнай дысцыпліны на прадпрыемстве, ад разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва і пастаноўкі палітвыхаваўчай работы. У цэнтры ўвагі неабходна паставіць клопаты аб людзях, стварэнне для іх добрых умоў для работы. Гэтым пытаннем усім кіраўнікам, пачынаючы ад Наркамата і канчаючы прадпрыемствам неабходна ўдзяліць максімум увагі і тады поспехі гаспадарчага 1940 года ў значнай ступені перавысяць поспехі мінулага года.

Пад кіраўніцтвам Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) і яго вялікага правадыра таварыша Сталіна, пры актыўнай дапамозе стаханаўцаў і ўдарнікаў, з задачамі, пастаўленымі партыяй і ўрадам, лёгкая прамысловасць у 1940 годзе справіцца з поспехам.

# ...Зайздросцім унукам і праўнукам нашым,

## УПЕРАДЗЕ РАДАСЦЬ І ШЧАСЦЕ

Мінулы 1939 год уся наша сям'я сустракала ў турмах былой панскай Польшчы. Я, маці і малодшыя тры браты сядзелі ў турмах. Мы цярпелі зверскія здзекі паліцэйскіх. Зімой у халодных, сырых камерах у нас пухлі рукі, ногі. Па тыдню нас не выпускалі на свежае паветра. Тысячы палітзняволеных дзяўчат і юнакоў змагаліся супроць панскага самаўладства. Гэта была шостая гадавіна майго прабывання ў турме і канцэнтрацыйных лагерах «Картуз-бярозе».

Толькі з 17 верасня 1939 года пачаліся дні радасці і шчасця для працоўных Заходняй Беларусі. Чырвоная Армія прынесла нам вызваленне.

Яшчэ больш радасці нясе для нашай сям'і і ўсіх працоўных Заходніх абласцей Беларусі 1940 год.

Паступова ліквідуецца беспрацоўе. У вёсках і мястэчках адкрываюцца школы, тэатры, кіно, больніцы, радзільныя дамы, дзіцячыя яслі і пляцоўкі. У мястэчку Свіслач, Валкавыскага павета абсталявана больніца на 30 ложкаў з радзільным аддзяленнем, амбулаторыяй і рэнтгенаўскім кабінетам. Адкрыт дзіцячы дом. Беднякам прадастаўляюцца добра абсталяваныя кватэры.

Цяпер я, шчаслівая грамадзянка Совецкага Саюза, весела і радасна разам з усімі працоўнымі соцыялістычнай краіны сустрэла новы самы шчаслівы год у маім жыцці.

**Елізавета Іосіфаўна Антановіч.**

Валкавыск

Сарра Каган

## МЕЧТЫ

И теперь вспоминает Марина
Нежданно явилась мечта,
Явилась, и словно на крыльях
С собою ее унесла:

— В небо, скорей бы подняться
И лететь, и лететь, и лететь,
На горы, моря и долины
С небесных высот посмотреть.

Поднялась бы я над Москвою,
Пролетела бы я над Кремлем,
И песню пропел бы пропеллер
Под самым родным мне окном...

Трудов не жалела Марина
И все, что казалось мечтой,
Стало прекрасною былью
И славой прошло над страной.

Часто мечтала Мария
На колхозные глядя поля:
Если бы взять я сумела
Все чем богата земля.

Победить бы и холод и ветер
Свеклу-б стране уберечь,
Как дочь меня Сталин бы встретил,
Сказал бы: «Вот так, молодец».

Трудов не жалела Мария
И все, что казалось мечтой,
Стало прекрасною былью
И славой прошло над страной.

Долго мечтала Ирина
Мечтала и ночью и днем:
— Если-б мне вырастить сына,
Чтоб был он могучим орлом,

Чтоб был он отважным и смелым,
Чтоб родину крепко любил,
Чтобы родной наш Сталин
За сына меня похвалил.

Трудов не жалела Ирина
И все, что казалось мечтой,
Стало прекрасною былью
И славой прошло над страной...

Всюду где мысль живая
Бьет сильным и свежим ключом,
Женщины наши мечтают,
Мечтают они обо всем.

Славою мчится над миром
Советская наша мечта
И стала всемирной мечтою
Свободная наша страна.

Мечтайте-ж, родные, мечтайте,
О самых серьезных делах,
Мечта наша—это не сказка,
Мечта наша в наших руках.

Мечтайте-ж, родные, мечтайте,
Открою и я вам мечту,
Как самую яркую песню
В сердце ее я ношу.

Слова подобрать бы, как бисер,
Как жемчуг бы их нанизать
С них песню-б сложить о родимом
В Кремле перед ним прочитать.

И если-б улыбку родную
Вызвала песня моя,
Самой, самой счастливой
В мире я была-б тогда.

## РАДАСНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Прашоўшы год для мяне быў асабліва радасным і шчаслівым. Усе намечаныя планы я ажыццявіла паспяхова. Была на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Разам са сваёй роднай сястрой ездзіла на курорт у Сочы. І самым радасным і самым дарагім для мяне з'яўляецца тое, што на маю долю выпала шчасце быць сакратаром акруговай выбарчай камісіі, дзе балатыраваўся таварыш Сталін у дэпутаты Мінскага горсовета. Я сваёй рукой выпісвала яму пасведчанне дэпутата Горсовета.

Новы 1940 год будзе яшчэ больш шчаслівым. Я стаўлю перад сабой задачу—забяспечыць выкананне плана, добра асвоіць тэхніку прадпрыемства; усямерна павышаць свой палітычны ўзровень шляхам глыбокага вывучэння Кароткага курса гісторыі нашай партыі; павышаць свой тэхнічны ўзровень. Хачу паехаць на экскурсію на вялікі станкабудаўнічы завод.

Спадзяюся, што пастаўленыя перад сабой задачы ў гэтым годзе ажыццяўлю гэтак паспяхова, як і ў 1939 годзе.

**Рахіль Львоўна Нахмановіч—інжынер завода ім. Кірава.**

Мінск.

# якім суджана бачыць Расію ў 1940 годзе.

В. Белінскі.

## Атрымаю дыплом совецкага ўрача

Усе грамадзяне Краіны Советаў з вялікай радасцю сустрэлі новы шчаслівы 1940 год, які абяцае ўсім многае. 1939 год быў годам велізарных перамог і дасягненняў нашай краіны. Мінулы год прынёс радасць і шчасце ўсяму совецкаму народу і 13 мільёнам нашым братам—беларусам і украінцам, якіх вызваліла доблесная Чырвоная Армія ад прыгнёту польскіх паноў.

Мінулы год прынёс і мне многа радасці і шчасця. Я з поспехам на «выдатна» скончыла IV курс медыцынскага інстытута і ўжо здала два галоўных прадметы за V курс на «выдатна».

У гэтым годзе я падвяла вынік сваёй трохгадовай агітацыйнай работы на выбарчым участку. Мае выбаршчыкі 24 снежня ў трэці раз прышлі ўсе як адзін да выбарчых урнаў і выканалі свой грамадзянскі абавязак перад краінай, аддалі свае галасы за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

1940 год з'яўляецца для мяне рашаючым. У гэтым годзе я скончу вышэйшую навучальную ўстанову і атрымаю дыплом совецкага ўрача. Я прыкладу ўсе свае сілы, каб гэты дыплом быў выдатным. Такое вялікае шчасце дасягаема толькі ў нашай краіне, якой кіруе родны і любімы Сталін. У гэтым годзе я таксама мару ўступіць кандыдатам у члены партыі Леніна—Сталіна. Усе свае веды я выкарыстаю на блага народа, які мяне вырасціў, вывучыў, выхаваў і з гонарам буду выконваць абавязкі совецкага ўрача.

**Марыя Лукінічна Мяснікова—студэнтка Медінстытута.**

Мінск.

Токар-стаханавец Магілеўскага аўтарамонтнага завода Х. С. Агрэс (злева) і бухгалтар Облхарчторга Л. А. Богуш у выходны дзень на гарадскім катку. Фота А. Розельмана (Фотахроніка БЕЛТА).

## МАРЫ СТАЛІ БЫЛЛЮ

З ранніх год з'явілася ў мяне зацікаўленасць да вывучэння авіяцыйнай справы. Я многа чытала кніг, журналаў і брашур пра авіяцыю, пра нашых доблесных лётчыкаў. З вялікім захапленнем глядзела кіно-карціны, у якіх удзельнічалі лётчыкі. У дзень свята авіяцыі, будучы на аэрадроме, я ўважліва сачыла за палётамі і думала аб адным: Вось, каб мне так паляцець. Гэтую думку я імкнулася ажыццявіць.

У 1939 годзе я паступіла ў Мінскі аэраклуб. З усёй сур'ёзнасцю і захапленнем прыступіла да тэарэтычных заняткаў. У красавіку 1939 года здала залікі па тэорыі авіяцыі, па матэрыяльнай часці самалёта і матора, і астатнім прадметам на «выдатна». Праз некалькі дзён прадстаялі першыя палёты. Іх я чакала з пачуццем радасці і трывогі. Адзіная думка не пакідала мяне—як найлепш асвоіць лётную практыку і асвоіць толькі на «выдатна».

Дзякуючы сур'ёзным і ўважлівым адносінам да тлумачэнняў інструктара, дзякуючы ўпартай і настойлівай рабоце над сабой, я хутка авалодала лётнай практыкай упраўлення самалётам. Вылецела ў самастойны палёт другой з групы дзяўчат, якія займаліся ў аэраклубе. Экзамены па тэорыі і практыцы лётнай справы я здала на «выдатна». Але гэта толькі першы этап, пастаўленай перад сабой мэты.

У 1940 годзе я стаўлю перад сабой задачу—паступіць у лётную школу Асоавіяхіма, або грамадзянскага паветранага флота і скончыць яе таксама на «выдатна». Я хачу стаць лётчыкам грамадзянскага паветранага флота, або працаваць у аэраклубе інструктарам і рыхтаваць з нашай шчаслівай моладзі гордых сокалаў краіны соцыялізма.

**Г. А. Кузнецова.**

Мінск.

# Пісьмы патрыётак

Байцы Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі з іменем Сталіна на вуснах ішлі ў бой за вызваленне нашых адзінакроўных беларусоў з-пад іга польскіх паноў і капіталістаў. У часе ваенных падзей у Заходняй Беларусі байцы і камандзіры атрымлівалі пісьмы ад баявых падруг—жонак і сясцёр, якія натхнялі іх на барацьбу, на гістарычныя перамогі.

Сястра чырвонаармейца Коліна даведалася аб тым, што брат пайшоў выконваць заданне партыі і ўрада. Яна напісала яму:

«Шура, спадзяюся, што ў гэтыя дні ты будзеш асабліва акуратным да сваіх абавязкаў. Раю табе не толькі як брату, але і як комсамольцу пільна сачыць за ўсімі падзеямі і быць гатовым к адпору ворага. Ты маеш вышэйшую асвету і свае веды як можна лепш перадай сваім байцам. Шура, калі што здарыцца, то будзь спакойным, не траць рассудка. Рызыкуй, але так, каб рызыка была карыснай для самога, а галоўнае для інтарэсаў нашай радзімы.

Усе атрыманыя веды ў Чырвонай Арміі прымяняй цяпер на практыцы. Улічы, што совецкія кулі не павінны прапасці дарэмна, а байцы ўсе павінны астацца жывымі. Не трусі, не ганьбі сябе і нас».

Александр Колін у адказ на пісьмо сястры піша:

«Абавязак совецкага грамадзяніна-воіна з гонарам апраўдаю. Я буду геройскі біцца з ворагамі і на справе апраўдаю званне члена ленінскага комсамола».

Наказ сястры тав. Колін выканаў. Ён энергічна наступаў з часцю. Калі часць прыпынілася на некаторы час на станцыі, Колін разам з тав. Айропецьян пайшоў за прадуктамі для байцоў. Насустрач ім ехалі сялянскія павозкі. Яны былі спынены. Аказалася, што разам з сялянамі сядзелі тры жандармы, якія былі пераапрануты ў грамадзянскае адзенне. У гэтых «сялян» пры вобыску адабралі 3 рэвольверы, тры вінтоўкі, кінжал і ланцугі. Жандармы прабіраліся ў тыл Чырвонай Арміі для ўтварэння дыверсійных актаў. Дзякуючы пільнасці і знаходлівасці Коліна і Айропецьян дыверсанты былі затрыманы.

Жонкі байцоў і камандзіраў жылі дружным калектывам. У іх было адно жаданне, каб іх мужы з гонарам выканалі ўскладзеную на іх задачу.

Калі жонка малодшага камандзіра Курыльскага даведалася аб гераічнай смерці свайго мужа, жонкі камандната састава абкружылі яе клопатамі. Яна напісала камісару пісьмо такога зместу:

«Даведаўшыся аб смерці свайго мужа, які загінуў на баявым пасту, я прашу вас і ўвесь калектыў байцоў, камандзіраў і палітработнікаў, чэсна выконваць свой абавязак перад радзімай, урадам і перад дарагім правадыром, другам і настаўнікам усіх працоўных таварышам Сталіным. Мужна і геройскі змагайцеся за вызваленне прыгнечаных братоў па класу.

Я спадзяюся, што мне, як жонцы загінуўшага байца, вы ўкажаце шлях у далейшым жыцці, каб жыць і працаваць на блага нашай радзімы і адпомсціць ворагу за смерць свайго мужа і другіх байцоў, гераічна паўшых у баю за вызваленне працоўных».

Гэтыя пісьмы гавораць аб тым, што нашы жонкі і сёстры ставілі грамадскія інтарэсы вышэй сваіх асабістых. Былі дома непаладкі, але аб іх мы не ведалі. І гэта не адбівалася на выкананні нашых задач. Вось я прыводжу адно з пісем, атрыманае ад жонкі т. Капыловым.

«Ну, Жэня, цяпер аб нашым здароўі,—гэта справа мінулага, так што я магу напісаць. Хварэў Дзіма, хварэла і я. Ляжала два тыдні. Было вельмі дрэнна, але зараз адчуваю сябе лепш. Калі-б не жонка камандзіра тав. Зыбіна я не ведаю, што-б я рабіла. Яна мяне даглядала і клапацілася аба мне. Калі ты яе сустрэнеш, падзякуй».

Знаходзячыся ў цяжкім становішчы тав. Капылова не паведаміла аб гэтым мужу, а напісала толькі тады, калі паправілася яе здароўе. Яна даражыла спакоем мужа і не хацела, каб гэта адбівалася на яго настроі ў дні гераічных спраў.

Нашы жанчыны—патрыёты радзімы. Яны пільна сочаць за падзеямі і не дрэнна ў іх разбіраюцца. Яны гатовы кожную мінуту стаць побач са сваімі мужамі і біць ворага там, адкуль ён з'явіцца.

**Юрый Грушэцкі—**
**старшы палітрук.**

Па ініцыятыве ўдзельніцы баёў каля возера Хасан А. Ф. Патапавай, якая ўзнагароджана медаллю „За боевые заслуги", жонкі камандзіраў і слухачоў Ваеннай акадэміі імені Фрунзе адправілі байцам, камандзірам і палітработнікам Ленінградскай Ваеннай Акругі новагоднія падарункі.

На здымку: Жонкі камандзіраў і слухачоў акадэміі за адборам падарункаў у магазіне Ваенгандля. Справа налева: С. Намсарава, А. Г. Пестава-Пастнікава, Н. К. Сенаткіна, А. Ф. Патапава, Л. Ф. Жураўлёва, С. І. Ільічова і прадавец Ваенгандля Н. Н. Вараб'ёва. Фота М. Рунэ (Фотакліше ТАСС).

# Дзяржаўны дзеяч

За вакном пурга, першая зімняя пурга—весніца прышоўшай зімы. Адразу і не разбярэшся ў гэтай завірусе—ці ноч гэта, ці раніца. Але Наталля Герасімаўна за год работы прызвычаілася вызначаць, калі ёй трэба ісці да цялят.

— Куды ты, паўночніца ў такое надвор'е? Бачыш, што робіцца на вуліцы. Пачакала-б, мо' сціхне.

— Ну, што ты, мама, куды там чакаць, калі 5 гадзін...

Да кароўніка трэба было ісці каля поўкіламетра. З цяжкасцю, перамагаючы парывы ветру і сумёты, закрываючы рукавом ад калючага снега твар, прабіраецца да яго Наталля Герасімаўна. Ля самага кароўніка, у некалькіх кроках ад сябе, яна адрознівае знаёмую постаць загадчыка фермы.

— Адчыняй, Андрэй Фёдаравіч.

— Адчыняю, ды вось снегу намяло. Прышоў праверыць,— ці не набедакурыў вецер. Праходзь...

Больш года Наталля Герасімаўна працуе цялятніцай фермы калгаса «Звязда». У снежні 1938 года праўленне даручыла ёй першую групу нованароджаных цялят.

— Управішся Наталля?

— Чаму-ж не,—падумала Наталля.—Да гэтага-ж часу спраўлялася з другімі работамі.—І спакойна адказала:

— Спраўлюся.

Але з першага дня Наталля Герасімаўна адчувала, што справа тут куды больш складаная, чым, скажам, у паляводчай брыгадзе, Што ні гавары, а цяляты—жывыя стварэнні, ды яшчэ такія някемлівыя, якіх і есці вучыць трэба. Наталля Герасімаўна настойліва вучыла цялят, аднятых ад мацярэй, піць малако з вядра. Гадзінамі праседжвала яна ля цяляці, паіла і з пальца і з далоні, не адыходзіла да таго часу, пакуль яно не наядалася.

А тут яшчэ, што ні дзень—новыя цяляты нараджаюцца. Адных ад мацеры адвучай, другім корм рыхтуй—макуху вары, сечку змешвай (сена хоць і было, але недастаткова).

У канцы другога тыдня ў Наталлі Герасімаўны было ўжо 18 цялят. Рана ўставала яна ў гэтыя дні, позна клалася. Але ўсё-ж цяляты, як гаворыцца, былі пастаўлены «на ногі».

— І калі-ж гэта ты, Наталля, за сваёй гаспадаркай глядзіш? У цябе-ж дзеці малыя,—чула часта Наталля заўвагі з боку асобных калгасніц.

У такім выпадку яна злавалася, быццам гаварылі ёй жорсткія словы незаслужанай крыўды.

— Ну, наконт дзяцей, дык яны ў мяне не горш чым твае выхоўваюцца. А, па-другое, такога калгасніка, што лічыць сваім толькі тое, што ў яго на двары, а калгаснае дабро яму нібы чужое, я ні за што лічу. Калі працаваць, дык трэба працаваць добра, а дрэнна працаваць, то лепш зусім не браца.

... Ад калгаса неабходна было паслаць каго-небудзь з жанчын на жывёлагадоўчыя курсы. Прапанавалі Наталлі Герасімаўне.

— Як на курсы, а за цялятамі хто глядзець будзе?—Наталлі Герасімаўне здалося немагчымым даверыць сваіх гадаванцаў, у выхаванне якіх яна ўкладае столькі любві і энергіі, у другія рукі, хоць-бы і на два тыдні.

... Наталлю Герасімаўну Малчан выбралі дэпутатам Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных. У перадвыбарныя дні яна расказвала сваім выбаршчыкам сваю біяграфію.

Біяграфія... Што памятае Наталля Малчан з усяго свайго жыцця да калгаса?—Праца, няўмольная, бязрадасная праца за кавалак хлеба і цёплы куток. Была дзіцем—памятае хмурыя твары бацькі і мацеры, якія позна вечарам вярталіся з работы, моўчкі садзіліся за стол і моўчкі клаліся спаць з тым, каб раніцой зноў ісці на работу.

Шчасце прышло толькі з калгасным жыццём. Як цяпер памятае Наталля Герасімаўна першы калгасны выхад у поле, першыя выклікі падруг, першыя абавязацельствы. На працягу пяці год работы ў калгасе яе не раз прэміравалі, пасылалі ў Маскву на выстаўку, у Мінск на нараду стаханаўцаў, а цяпер вось калгаснікі даверылі ёй быць іх дэпутатам у абласным Совеце дэпутатаў працоўных.

Наталля Герасімаўна Малчан стала дзяржаўным дзеячом. Яна прыкладзе ўсе сілы для таго, каб апраўдаць давер'е народа.

Калгас „Звязда" Рудзенскага раёна. **Шарапаў.**



**Выбаршчыцы—члены сельгасарцелі „Сеніца" (Падгайскі сельсавет, Мінскі раён) тт. Ланеўская і Зернятко апускаюць у урну бюлетэні.**
Фота І. Шышко (Фотахроніка БЕЛТА).

Г. Андэрсен

# Дзяўчынка і запалкі

Быў страшэнны мароз. Выла мяцеліца. Усё атуляла вячэрняя цемната. Гэта быў апошні дзень старога года—заўтра новы год.

У гэтую сцюжу, па глыбокім снягу, ішла па вуліцы маленькая дзяўчынка, босая, з голай галавой. Праўда, на ёй былі туфлі калі яна вышла з дому, але што можна было з імі зрабіць, з гэтымі вялізнымі туфлямі, якія маці насіла ў апошні час. Яны былі такія вялікія, што дзяўчынка згубіла іх, перабягаючы цераз вуліцу, калі амаль побач з ёю пралятелі дзве карэты. Адзін туфель ёй удалося знайсці, а з другім уцёк хлопчык.

Дзяўчынка ішла цяпер босая, ножкі яе пасінелі ад холаду. У старым фартушку трымала яна некалькі пачак запалак; а на руцэ яе вісеў клуначак. Ніхто не купіў у яе за цэлы дзень ніводнага карабка, ніхто не падаў ёй ані грошыка.

Стомленая, яна ледзь перасоўвала ногі... Камкі снегу падалі на яе залатыя валасы, якія так прыгожа кучаравіліся. Выгляд у яе быў такі загнаны, такі няшчасны.

Ва ўсіх вокнах ззялі агеньчыкі. На вуліцы стаяў прыемны пах смажанага гуся. Заўтра-ж Новы год—вось аб чым думала дзяўчынка.

На рагу паміж двума дамамі, з якіх адзін выдаваўся на вуліцу больш другога, яна села на тратуары, згорбілася, падкурчыла пад сябе ногі. Холад пранізваў усё цела дзяўчынкі.

Дадому яна не магла вярнуцца: яна-ж не прадала ніводнага карабка запалак, не зарабіла ніводнай капейкі. Бацька яе прыб'е. Ды і холадна там, у хаце—не палена; па пакоі ходзіць вецер, хоць вялікія шчыліны і заткнуты саломай і пакуллем. Ручкі яе ўжо зусім зайшліся ад холаду.

Ах! А маленькая запалка магла-б яе сагрэць, калі-б толькі яна пасмела дастаць яе з карабка і чыркнуць.

Дзяўчынка дастала запалку і чыркнула. Як запалала яна, як загарэлася! Заблішчэў гарачы светлы агеньчык, як свечка, і дзяўчынка прыкрыла яго далонямі. Які цудоўны гэта быў агонь!

Дзяўчынцы адразу здалося, што яна сядзіць каля вялікай жалезнай печкі. Агонь так прыемна грэў, так прыемна грэў яе. Ах, як добра. Малышка ўжо працягнула ножкі, каб пагрэць іх... Але полымя пагасла, печка знікла, яна сядзела адна з абгарэлай запалкай у руцэ.

Дзяўчынка запаліла новую. Запалка загарэлася, заззяла. Там, дзе ад запалкі святло лягло на сценку, сцяна зрабілася празрыстай, як вуаль. За ёю дзяўчынка ўбачыла прыгожы пакой. Стол, засланы бялюткім абрусам, быў устаўлены прыгожай фарфаравай пасудай. Смажаны гусь, начынены сліўамі і яблыкамі, так смачна пахнуў. А што было яшчэ больш дзіўным—гусь саскочыў з блюда і закавыляў па падлозе з відэльцам і нажом на спіне. Ён ішоў проста да яе. Тут запалка патухла, і перад дзяўчынкай стаяла толькі тоўстая халодная сцяна.

Яна запаліла яшчэ адну запалку і ўбачыла сябе перад надзвычайна прыгожай ёлкай. Ёлка гэта была яшчэ большая і прыгажэйшая за тую, якую яна бачыла летась праз шкляныя дзверы купецкага дома. Тысячы свечак гарэлі на зялёных галінках. Рознакаляровыя цацкі, малюнкі вабілі, цягнулі да сябе.

Дзяўчынка падняла рукі ўгару—і запалка згасла. А ёлачныя свечкі падымаліся ўсё вышэй і вышэй. Яна бачыла, як сталі яны на небе яснымі, і адна з іх паляцела некуды, пакінуўшы на небе даўгую агністую паласу.

Дзяўчынка зноў чыркнула. Запалка загарэлася. І раптам перад ёю з'явілася старая яе бабка,—такая ясная, празрыстая і добрая.

— Бабулька!—крыкнула яна.—Вазьмі мяне з сабой. Я ведаю, што ты знікнеш, як дагарыць запалка, знікнеш, як жалезная печка, як смажаны гусь, як вялікая чароўная ёлка.

І дзяўчынка, спяшаючыся, паліла адну за другой запалкі,—так ёй хацелася ўтрымаць бабку. Бабка яшчэ ніколі не здавалася ёй такой чароўнай, такой вялікай. Ласкава абняла яна дзяўчынку. Не адчувалася болей ні холаду, ні страху. А назаўтра раніцой на рагу вялікага дома знайшлі маленькую дзяўчынку з чырвонымі шчочкамі. Яна замерзла ў апошні дзень старога года.

На бал-маскарадзе вучняў старшых класаў Сталінскага раёна г. Мінска ў Палацы піянераў, прысвечаным новаму году і зімовым канікулам. Фота В. Грунтфеста.

Каля навагодняй ёлкі ў Мінскім Палацы піянераў і окцябрат. У цэнтры—Цыля Баркан, вучаніца 8 школы, выконвае „Лезгінку". Фота В. Грунтфеста.

# Агні вясёлай ёлкі

У рабочага—штукатура Беларускага Будтрэста Пятра Осіпавіча Кірылычава быў выходны дзень. Ён цалкам прысвяціў яго сямейнаму дзіцячаму свяцу, якое яшчэ задоўга абяцаў старшым дочкам Гале і Вале, калі яны прынясуць за паўгоддзе хоць-бы чатыры адзнакі «выдатна». Галя прынесла шэсць выдатных адзнак, Валя—пяць і Кірылычаў рашыў стрымаць слова.

Калі ёлка была прыбрана, прышлі госці—падругі Галі і Валі па школе, равеснікі шасцігадовага Ігара па дзіцячаму саду, дзеці з суседніх кватэр. Пачалася захапляючая святочная весялосць. Ёлка загарэлася агнямі і стала яшчэ прыгажэй, дзеці ўволю набегаліся, хорам праспявалі піонерскую песню аб Сталіне. Валя, Галя і іх падруга Зіна вельмі добра пратанцавалі матроскі танец. Усе доўга апладыравалі ім, асабліва Гале, якая ў канцы пляскі пусцілася ў прысядку. Яна адна ўмела так лоўка адбіваць матроскую чачотку.

Кірылычаву здалося, што ён скінуў сёння са сваіх плеч добры дзесятак годаў. Дзеці стаміліся і каб утрымаць іх на месцы, Пётр Осіпавіч прапанаваў гульню, якую сам ахрысціў: «Расказы ля кастра».

Гульня аказалася вельмі простай, але разам з тым захапляючай. Кожны ўдзельнік павінен быў расказаць які-небудзь цікавы эпізод з свайго жыцця ці памарыць аб будучым. Расказ павінен быць кароценькім і ў канцы яго агульным галасаваннем прысудзіцца прэмія—падарунак.

Пачаў гэту своеасаблівую гульню той, хто прапанаваў яе—Пётр Кірылычаў.

— Дзеці, я вам многа не раскажу, я не майстар на вялікія апавяданні. Дык вось, калі я быў у такім узросце, як вы, мне ёлак не рабілі і пазней я не меў магчымасці весяліцца, як вы, на ёлцы. Дзе-ж было думаць аб ёлцы, калі мне з 11 год прыходзілася зарабляць не толькі на сябе, але і на ўсю сям'ю.

Кірылычаў гаварыў ціха і проста. Слухалі яго з вялікай увагай.

— А ці ведаеце, калі я папаў на першую ёлку? Тады, калі мне было 28 год.

Гэтага расказа бацькі, які прымаў удзел у грамадзянскай вайне, у радах будзённаўскай конніцы, дзеці яшчэ ніколі не чулі і таму стала яшчэ цішэй. Нават Ніначка і тая застыла на месцы.

— Наш конны атрад вось такой зімовай парой 1919 года прабіваў дзенікінскі фронт. Памятаю, як цяпер камандзір атрада паслаў 20 байцоў, у тым ліку і мяне, у разведку. У адным памешчыцкім маёнтку засеў штаб белага палка. Мы ўсе рваліся ў баявую справу і калі пад'ехалі да штаба, пачулі з-за вакон музыку. Весяляцца,—падумалі мы. Ну, ладна, мы вам зараз падбавім весялосці. Нечаканым рыўком мы ўварваліся ў дом. Там была афіцэрская ёлка. Ох і далі-ж мы ім тады жару, здаецца век яны не забудуць гэту ёлку. Потым, калі падышоў увесь атрад мы запрасілі сялянскіх рэбят і наладзілі для іх весялосць. Тады і я ўпершыню пагуляў на ёлцы...

— Першую прэмію папе... папе... папе...—закрычалі дзеці задаволеныя расказам.

— Не, не,—замахаў рукамі бацька.—Галя твая чарга расказваць.

... Свята совецкай ёлкі глыбока ўвайшло ў наш быт. У палацах піянераў, школах, установах і на даму тысячы ёлак бліскаць срэбрам свайго цудоўнага ўбрання. Шчаслівыя дзеці нашай краіны весяляцца вакол іх і ў песнях сваіх славяць партыю, славяць радзіму, славяць вялікага Сталіна за сваё дзяцінства.

Гэта падзяка ад шчырага сэрца, ад усёй душы.

Ефімаў.

# МАШЫНІСТ

Цягнік абмінуў аднапавярховы каменны домік станцыі Стоўбцы і па нядаўна пашыранай каляіне паімчаўся далей. Валя Бондарава—дваццацігадовая дзяўчына ў шырокай спецоўцы машыніста першы раз вяла цягнік па гэтай дарозе. Яна кіравала сваім родным паравозам, на якім ужо ездзіла другі год і таму не гледзячы на тое, што кругом мільгацелі незнаёмыя месцы, ёй усё здавалася звычайным. Рытмічна пастукваючы калёсамі, адкідаючы метр за метрам, імчаўся ўперад паравоз.

Станцыя Гарадзей. Так і ёсць, ёй гаварылі 25 мінут язды ад Стаўбцоў. Паравоз убавіў ход і спыніўся на сваім звычайным месцы насупраць палісадніка з паблеклымі кветкамі.

Валя паглядзела ў топку і загадала качагару параўнаць агонь, дастала свежую паклю, добра выцерла рукі і спрытна пераступаючы праз сходачкі, саскочыла на зямлю.

Гэта быў першы совецкі цягнік, прыбыўшы на станцыю Гарадзей і не дзіўна, што ўвесь перон быў запоўнен мясцовымі жыхарамі. Яны сабраліся паглядзець на прыгожыя вагоны, якія рэзка адрозніваліся ад польскіх клятушак, на магутны паравоз з чырвонай пяціканцовай зоркай.

І раптам у натоўпе ўбачылі дзяўчыну-машыніста, лоўка саскочыўшую на зямлю. Усе зараз-жа наблізіліся да паравоза. Валя, не разумеючы ў чым справа, таксама абярнулася і кінула неспакойны погляд на паравоз—няўжо што-небудзь здарылася? Але паравоз, выпускаючы пару, быццам адпачываў пасля хуткага бегу. Заспакоіўшыся Валя зняла свой чорны берэт і пачала папраўляць непаслухмяныя валасы. А між тым, натоўп стаў нарастаць і Валя як-бы апынулася ў кальцы. Яна ўсё яшчэ не разумела ў чым справа. Найбольш храбрыя з натоўпу пачалі падаваць рэплікі і пытанні.

— Гэта вы прывялі цягнік? Вы машыніст?—не скрываючы здзіўлення запытаў пажылы чалавек у плашчы, выступаючы ўперад.

— А што-ж тут такога?—усё яшчэ не разумеючы здзіўлення людзей, сказала Бондарава.

— Мне шэсцьдзесят год, а я першы раз бачу жанчыну-паравознага машыніста,—з той-жа прыкметнай ноткай здзіўлення прагаварыў пажылы чалавек у плашчы.

— Ах, вось у чым справа?—нарэшце зразумела Валенціна Бондарава і азірнулася кругом. Не менш 50 чалавек сабралася вакол яе.

— Так вы гаворыце, што на былых панскіх чыгунках не было жанчын-машыністаў?

— Так, не толькі машыністаў,—умяшаўся у гутарку чыгуначнік у польскім касцюме,—праваднікамі і тымі не маглі быць жанчыны.

— Праваднікамі? — здзіўлена перапытала Валенціна.—А ў нас—вось не чулі?—начальнікам чыгункі ў Маскве жанчына Зінаіда Троіцкая. Я яе ведаю, яна таксама машыніст.

— Цёця, а вы даўно ездзіце?—запытала дзесяцігадовая дзяўчынка з кніжкамі, мабыць школьніца.

— Два годы,—адказала Бондарава,—спачатку памочнікам, а вось ужо сем месяцаў машыністам. У нас многа, такіх як я, займаліся на курсах у Гомелі. Там было сто дзяўчат.

— А вам не цяжка?

— Калі ўмееш і ведаеш справу, то не цяжка.

Валя, зразумеўшы чаму з такой цікавасцю аднесліся да яе—першай совецкай дзяўчыны—машыніста на гэтай вызваленай зямлі, коратка пераказала сваё жыццё, заключыўшы:

— Самалётам цяжэй кіраваць, чым паравозам, а вы мабыць пра Грызадубаву і другіх нашых лётчыц чулі?

— Пра гэта чулі.

— Нас, совецкіх дзяўчат, не прымушаюць быць толькі краўчыхамі. Выбірай любую прафесію. І вучыся і працуй. У мяне і брат машыніст і бацька сорак год на чыгунцы.

Прабіваючыся праз натоўп да Валі падышоў уноў прызначаны начальнік станцыі Гарадзей, шырокаплечы мужчына ў форме совецкага чыгуначніка.

— Таварыш Бондарава, што гэта вас абкружылі?

— Гавораць, што не бачылі да гэтага жанчыны-машыніста.

— Такіх тут не было. Цяпер адбою няма вось,—прыходзяць дзяўчаты з мястэчка, вёсак і пытаюцца ці будуць іх прымаць на чыгунку.

— А ці праўда, што будуць?—запытала дзяўчына з натоўпу.

— Канечна будуць!—адказаў начальнік станцыі.

— Не білетнымі касіршамі, не, а на паравозы?—задала пытанне тая-ж дзяўчына з натоўпу.

— І машыністамі паравозаў,—падкрэсліваючы сказаў начальнік станцыі.—Толькі для гэтага патрэбна будзе на курсах вучыцца, а курсы такія створаць вельмі хутка.

Дзяжурны прынёс прапускное жазло і ветліва перадаў яго Вале Бондаравай. Тая прыняла жазло, хутка паднялася на паравоз, памахала сабраўшымся рукой. Цягнік крануўся. У натоўпе заапладыравалі...

Па другому зажылі ў былой Заходняй Беларусі. Збыліся словы начальніка станцыі. Дзяўчатам—новым совецкім грамадзянам адчыніліся дзверы да тых прафесій, якія ім раней былі недаступны. У Беластоку, Брэсце, Пінску створаны першыя чыгуначныя жаночыя курсы. У складзе іх былыя беспрацоўныя дзяўчаты, якія працавалі за прылаўкам у прыватных магазінах, хатнія работніцы, швейніцы, якія рашылі перакваліфікавацца. Усяго на курсах вучыцца да ста чалавек. Гэта будзе першы атрад чыгуначніц з ліку былых забітых і замучаных грамадзянак.

У Беластоку на такіх курсах навучаецца Рэвека Смолкіна—стройная чорнавокая дзяўчына, былая сядзелка ў прыватнай больніцы. Яна любіць фізічную працу, яна навучылася кіраваць аўтамабілем, але гэтага мала, гэта даступна. А вось паравозам упраўляць—гэта вялікае мастацтва.

Совецкая краіна адкрыла тысячам дзяўчат заходніх абласцей БССР семафор у яркае, цікавае, багатае жыццё.

**Е. Садоўскі.**

# Дэпутат-ордэнаносец

Наша Ліза,—так завуць у калгасе імені Мікаяна маладую дзяўчыну-калгасніцу Елізавету Васільеўну Шэстак. І ў гэтых словах адчуваецца гордасць і шчырая павага.

Елізавеце Васільеўне толькі споўнілася дваццаць год. Аднак вельмі часта пажылыя калгаснікі зварачваюцца да яе за парадамі, як да старэйшага таварыша. Тав. Шэстак—звеннявая па ільну. Гэта выдатны майстар высокіх ураджаяў, таленавіты арганізатар калгаснай працы.

Тры годы таму назад Талачынскі раён здаваў дзяржаве 7760 цэнтнераў ільновалакна, а зараз здае 12 000. За гэты час сярэдняя ўраджайнасць ільну па раёну ўзрасла на 300 процантаў. У барацьбе за высокія паказчыкі соцыялістычнай працы адно з перадавых месц належыць Лізе Шэстак.

У 1938 годзе Ліза з газет даведалася, што многія калгасы раёна і рэспублікі шляхам арганізацыі стаханаўскіх звенняў дабіліся рэкордных ураджаяў ільну. Яна спачатку сама добра абдумала як арганізаваць звенні ў іх калгасе, а потым звярнулася за парадай да старшыні. Старшыня калгаса тав. Усціновіч, уважліва выслухаўшы прадуманыя довады дзяўчыны, згадзіўся з яе прапановай.

Першае ў калгасе звяно было арганізавана. Ім кіравала Елізавета Васільеўне Лепшыя стаханаўкі калгаса Праскоўя Буракова, Марфа Шэстак, Праскоўя Усціновіч аднадушна падтрымалі каштоўную ініцыятыву Лізы і тут-жа запісаліся ў яе звяно. Яны абавязаліся дабіцца з гектара 8 цэнтнераў ільновалакна 12 нумарам.

Большэвіцкая напорыстасць, дала свае выдатныя рэзультаты. Зямля шчодра адплаціла за сумленную працу. Ураджайнасць з кожнага гектара на стаханаўскім участку дасягнула звыш 8,5 цэнтнера высокаякаснага валакна.

Не раз у часы летняй спёкі Лізу разам з усім звяном можна было бачыць на сваім участку. Лён вырас высокім. Каб ён не палёг увесь участак быў абстаўлен колікамі, абвіт роўнымі стрункамі шпагату.

Звяно ўдастоілася быць удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, а звеннявая тав. Шэстак занесена ў ганаровую кнігу перадавікоў сельскай гаспадаркі. Зараз у калгасе імені Мікаяна працуе ўжо 12 звенняў, пры чым усе звенні ўзначалілі калгасніцы, якія былі ў звяне Шэстак.

У мінулым годзе Ліза разам з другімі перадавікамі сельскай гаспадаркі БССР ездзіла ў Маскву, у Крэмль. Там яна ад Совецкага ўрада атрымала высокую ўзнагароду за выдатную работу на карысць соцыялістычнай радзімы. На грудзях у калгаснай дзяўчыны зззяе медаль «За трудовую доблесть».

Выбаршчыкі 60 выбарчай акругі аказалі тав. Шэстак вялікае давер'е—абралі яе дэпутатам Віцебскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

Пазіраючы на дачку старая маці кажа:

— Не спадзявалася, не думала, што мае дзеці будуць знатнымі людзьмі. Адзін сын мой на далёкай Поўначы—начальнік станцыі. Другі ў Маскве радыётэхнікам працуе, а самы малодшы ў Віцебску на агранома вучыцца. Дачка Аня працуе сакратаром Асвейскага райкома комсамола. Яна разам з Лізай была ў Крэмлі і ўдастоілася высокай узнагароды Совецкага ўрада. Вось чаму так многа радасці ў маім сэрцы, сэрцы маці.

Нядаўна таварыш Шэстак прынялі ў кандыдаты вялікай партыі Леніна—Сталіна.

**Эвальд.**

м. Талочын.

24 снежня, мансі, якія жывуць у Ташэмке, Іўдэльскага раёна, Свярдлоўскай вобласці, абралі дэпутатаў у месныя Советы дэпутатаў працоўных.
На здымку: Галасуе аленявод і паляўнічы, мансі П. В. Анямова.
Фота Ж. Берланд (Фотакроніка ТАСС).

Заможна жывуць калгаснікі лепшага ў Буйнакскім раёне (Дагестанская АССР) калгаса імені Сталіна. За апошнія 3 годы калгаснікамі пабудавана 20 дамоў з надворнымі будовамі.
На здымку: Калгаснік, былы батрак, Алібек Джаватбекаў са сваёй сям'ёй у новым доме.
Фота Б. Гурэева (Фотакліша ТАСС).

# Чаму я не веру ў бога

Раней я верыла ў бога, наведвала царкву, выконвала рэлігійныя абрады. Тады я не разумела—ёсць бог, ці няма яго, але выконвала настаўленні бацькоў і хлуслівыя байкі папоў.

Першае, што мне не падабалася, гэта неабходнасць саблюдаць посты. Закон гэты выклікаў у мяне вялікае сумненне. Я бачыла, як багатыя гэтага абраду не выконвалі і ўсё-ж жылі добра, а беднята колькі ні пасціла, усёроўна заставалася ў голадзе і холадзе. Больш таго, пасля «шчырага» посту захворвалі, а некаторыя нават паміралі. Дык дзе-ж тут была божая дапамога?

Або к прыкладу такі факт. Калі я выходзіла замуж, абавязкова трэба было вянчацца. Прыехалі мы да царквы раніцой, ды малы магарыч папу далі. На большы не хапала сродкаў. Паглядзеў поп на нас скоса, дый кажа:

— Не буду вянчаць, дабавіць трэба.

Цэлы дзень прасілі і ўмалялі папа, але нічога не дапамагло. Увечары прышлося пазычыць грошай і заплаціць столькі, колькі сказаў поп.

Ніколі не забуду такі выпадак. У нашай мясцовасці доўга не было дажджоў, пагражала засуха. Веруючыя ў бога з нашай вёскі паслалі да папа трох самых набожных жанчын з заданнем адслужыць малебен і прасіць у бога дажджу.

Вярнуліся пасланцы хутка, але з вельмі непрыемнымі вынікамі. Поп загадаў у адзін дзень выткаць сем аршын палатна для царквы. Тады толькі ён зможа адслужыць малебен.

Уся вёска была паднята на ногі—хто праў кудзелю, хто рыхтаваў станы для кроснаў, хто снаваў ніткі. Сем аршын палатна да вечара былі дастаўлены папу. Пераступіў поп з нагі на нагу ды і кажа:

— Ідзіце, жанчыны, дамоў, сёння і заўтра малебну служыць не буду. Каб не хадзілі вы да мяне дарэмна, я вам паведамлю аб малебне праз старасту.

Ішлі дні, а староста не з'яўляўся. Толькі праз тыдзень малебен усё-ж адбыўся.

А яшчэ праз некаторы час сяляне даведаліся, навошта спатрэбілася папу на такі вялікі час адкладваць вельмі тэрміновую справу. Уся загадка заключалася ў тым, што поп сам ніякай дапамогі ад бога не чакаў і таму не хацеў асароміцца перад прыхажанамі. Ён пільна сачыў за барометрам. І калі толькі ўбачыў, што барометр паказвае на дождж, хутка накіраваўся да царквы служыць малебен.

Пасля ўсіх гэтых папоўскіх махінацый я канчаткова парвала з царквой і рэлігіяй. На сваім асабістым жыцці я пераканалася, што бога няма, што папы адурманьваюць людзей і служаць выключна ў мэтах сваёй нажывы і інтарэсаў багацеяў.

Пры совецкай уладзе гэта мне стала яшчэ больш ясна. Пачала наведваць сходы, лекцыі, слухаць радыё. Я добра ўбачыла, як папы і іх прыхільнікі сталі прамымі ворагамі ўлады і працоўных.

Зараз я ў бога не веру, а жыву куды лепш, чым раней. Мне ўжо 50 год, але я адчуваю сябе маладой і бадзёрай. Працую даяркай у калгасе. У мінулым годзе на 660 працадзён я атрымала 100 пудоў збожжа, больш 200 пудоў бульбы, многа гародніны і іншых прадуктаў. Жыву культурна і заможна.

За адданую працу ў калгасе ўрад БССР узнагародзіў мяне граматай і прэміраваў грашыма.

З свайго боку я лічу, што ў нашым раёне яшчэ недастаткова праводзіцца антырэлігійная работа. Партыйныя і совецкія арганізацыі павінны больш займацца гэтай справай.

Ульяна ЯКУБОВІЧ.

Халопенічы, калгас
Новае Жыццё.

# Рыхтуемся да выстаўкі

Звыш тысячы калгасаў і сотні МТС, дзесяткі тысяч перадавіоў соцыялістычнай сельскай гаспадаркі былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 года. Гэтага гонару ўдастоіліся людзі з нашага калгаса, якія дабіліся высокай ураджайнасці.

Выстаўка з'яўлялася для нас вялікай школай барацьбы за большэвіцкія ўраджаі ў калгасе, за высокую прадукцыйнасць і развіццё жывёлагадоўлі, за заможнасць калгаса і калгаснікаў. Нашы калгасніцы і калгаснікі абагаціўшыся вопытам сельскагаспадарчай выстаўкі па-баявому ўзяліся за падрыхтоўку да Усесаюзнай выстаўкі 1940 года.

Ураджай у нашым калгасе «Новае жыццё» ўдаўся на славу. Яравой пшаніцы з гектара мы знялі па 16,5 цэнтнера, ячменю—16 цэнтнераў, гароху 17,3 і ільнотрасты па 6 цэнтнераў з гектара.

Радасна, што пладатворная работа калгаснікаў і калгасніц на палях дала свае багатыя рэзультаты. Зернавых на 1 працадзень атрымаем па 4 кілограмы, бульбы—5 кілограмаў, па 1 рублю 50 кап. грашыма.

На прыкладзе асобных калгасных сямей можна пераканацца, як шчасліва і заможна жывуць усе калгаснікі нашага калгаса, нашай краіны. Тав. Краўчэнка С. атрымаў на свае працадні 4800 кілограмаў зернавых. Калгаснік Ходзюш каля 5 тон.

Зараз у нашым калгасе ідзе актыўная падрыхтоўка да выстаўкі 1940 года і адначасова да веснавой пасеўнай кампаніі. Калгаснікі вывозяць гной на поле. Ужо вывезена звыш 500 возаў.

Людзі разбіты на звенні. Лепшыя стаханаўкі, майстры соцыялістычных высокіх ураджаяў вылучаны звеннявымі. Кожнае звяно паасобку атрымала ўчастак зямлі, збірае попел на ўгнаенне, а таксама курыны памёт.

Усе калгаснікі абавязаліся працаваць на палях, а таксама на жывёлагадоўчых фермах па стаханаўску, каб выканаць пастаўленыя перад сабой задачы, дабіцца таго, каб калгас, «Новае жыццё» ў цэлым быў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 года.

**Екацерына Платонаўна Падалец—**
дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.
Чашніцкі раён.

На гумова-абутковай фабрыцы былой „Ардаль" у горадзе Лідзе горздравам адкрыт пункт першай медыцынскай дапамогі. Пры пункце працуе зубаўрачэбны кабінет.
На здымку: Работніца сартыровачнага цэха С. А. Грыншпан на прыёме ў зубнога ўрача М. М. Драйкінай.
Фота Б. Вернера (Фотахронніка БЕЛТА)

# ШЧАСЛІВАЯ СТАРАСЦЬ

15 год я з'яўляюся пенсіянеркай па старасці. Дзяржава забяспечвае мяне ўсім неабходным. Кожны месяц я атрымліваю пенсію па другой катэгорыі. Я адчуваю сябе шчаслівай. Я люблю працу і пайшла бы і цяпер работаць, але непасільная праца ў маладых годах, хаця яшчэ існавала царская ўлада, падарвала мае сілы і зараз я зусім непрацаздольная.

Дваццаць сем год я працавала на чыгунцы ў якасці вартаўніка,—некалькі год—на пераездзе, астатнія годы—на станцыі. На гэтай годзе свайго жыцця я спыніла работу, бо вымушана была падаваць і вучыць пяцерых дзяцей пры мізэрных сродках для існавання. Рана засталася ўдавой.

Толькі совецкая ўлада дапамагла мне вывучыць і вывесці ў людзі сваіх сыноў і дачок. Кожны год прыносіць мне вялікую радасць. Ніколі не білася так шчасліва маё сэрца, як у гэтыя дні. У радасных пісьмах мае дзеці расказваюць аб сваіх дасягненнях.

Старэйшы сын Антон працуе машыністам на паравозе. Другі сын Нікалай—майстар вагоннага ўчастка. Самы малодшы Грыгорый у гэтым годзе скончыў Маскоўскі інстытут інжынераў транспарта, нядаўна прызван у доблесную Чырвоную Армію. Чацверты сын Іван вучыцца ў Ваеннай Акадэміі, дачка замужам.

За сваю шчаслівую старасць, за сваіх дзяцей, якіх вывучыла совецкая ўлада, я вельмі ўдзячна Комуністычнай Партыі і яе правадыру таварышу Сталіну.

**Фёкла Афанасьеўна Хаткевіч—**
**пенсіянерка**
Асіпавічы.

# Вывучаем ваенную справу

З пачуццём вялікай радасці сустрэлі закон аб усеагульным воінскім абавязку вучні 31 сярэдняй школы. З першага дня прыняцця закона будучыя дапрызыўнікі з любоўю прыняліся за вывучэнне ваеннай справы, каб прыйсці ў Чырвоную Армію ўпаўне падрыхтаванымі байцамі.

Мы, дзяўчаты, не адстаем ад хлапцоў, таксама вывучаем ваенную справу, вучымся метка страляць і мятаць гранату. Пасля ўпартай падрыхтоўкі, я і мае падругі-комсамолкі здалі норму на «варашылаўскага стралка», добра вывучылі вінтоўку і тэхніку мятання гранаты.

Вучні вывучаюць ваенную справу для таго, каб у любую мінуту быць карыснымі радзіме.

**Доня Слёзберг—вучаніца**
**10 класа 31 школы.**
Мінск.

Максім Горкі

# 9 СТУДЗЕНЯ

(Урывак)

... Натоўп нагадваў цёмны вал акіяна, ледзь абуджаны першым парывам буры, ён цёк наперад павольна; шэрыя твары людзей былі падобны на каламутны грэбень хвалі.

Вочы блішчэлі ўзбуджана, але людзі глядзелі адзін на аднаго, быццам не верачы свайму рашэнню, здзіўляючыся самі з сябе. Словы круціліся над натоўпам, як маленькія шэрыя птушкі.

Гаварылі ціха, сур'ёзна, нібы апраўдваючыся адзін перад другім:

— Немагчыма больш цярпець, вось чаму пашлі...

— Без прычыны народ не рушыцца...

— Хіба «ён» гэтага не зразумее?..

Больш за ўсё гаварылі пра «яго», пераконвалі адзін аднаго, што «ён» добры—і ўсё зразумее... Але ў словах, якімі малявалі яго вобраз, не было фарбы. Адчувалася, што аб «ім» даўно, а магчыма ніколі—не думалі сур'ёзна, не ўяўлялі яго сабе жывой, рэальнай асобай, не ведалі што гэта такое і нават дрэнна разумелі—навошта «ён» і што можа зрабіць.

Але сёння «ён» быў патрэбен, усе спяшаліся зразумець яго і, не ведаючы таго, хто існаваў у сапраўднасці, мімаволі малявалі ў сваім уяўленні нешта вялізнае.

Вялікімі былі надзеі, яны патрабавалі вялікага для апоры сваёй.

Часам у натоўпе чуўся задзірысты чалавечы голас:

— Таварышы! Не ашуквайце самі́х сябе...

Але самаашуканства было неабходна і голас чалавека заглушаўся палахлівымі і абуранымі воплескамі крыкаў:

— Мы хочам адкрыта...

— Ты, братка, маўчы!..

— Да таго-ж,—айцец Гапон...

— Ён ведае!..

Натоўп нерашуча плёскаўся ў канале вуліцы, разбіваючыся на асобныя групы; гудзеў, спрачаючыся і разважаючы штурхаўся аб сцены дамоў і зноў заліваў сярэдзіну вуліцы цёмнай вадкай масай,—у ёй адчувалася непакойнае бушаванне сумненняў, было ясна напружанае чаканне чагосьці, што асвятліла-б шлях да мэты верай у поспех і гэтай верай злучыла, знітавала ўсе кавалкі ў адно моцнае, стройнае цела. Нявер'е стараліся захаваць і не маглі, заўважаўся непакой і нейкая асаблівая вострая чуласць да гукаў. Ішлі, асцярожна прыслухоўваючыся, зазіралі наперад, чагосьці ўпарта шукалі вачыма. Галасы тых, хто верыў у сваю ўнутраную сілу, а не ў сілу па-за сабой—гэтыя галасы выклікалі ў натоўпе спалох і абурэнне, занадта рэзкія для істоты, перакананай у сваім праве змагацца ў адкрытай бойцы з той сілай, якую яны жадалі бачыць.

Але, пераліваючыся з вуліцы ў вуліцу, маса людзей хутка расла, і гэты надворны рост паступова выклікаў пачуццё ўнутранага росту, будзіў свядомасць права народа-нявольніка прасіць ад улады ўвагі да сваёй пакуты.

— Мы таксама людзі, як ніяк...

— «Ён» зразумее,—мы просім...

— Павінен зразумець... Не бунтуем...

— Зноў-жа айцец Гапон...

— Таварышы! Свабоду не просяць...

— Ах, божа мой!..

— Але, пачакай ты, братка!..

— Ганеце яго прэч, д'ябла!..

— Айцец Гапон лепш ведае як...

Высокі чалавек у чорным пальто з рыжым лапікам на плячы, устаў на тумбу і, зняўшы шапку з лысай галавы, пачаў моцна, урачыста гаварыць з агнём у вачах і дрыжачым голасам. Гаварыў аб «ім», аб цару.

Але ў слове і ў тоне спачатку адчувалася нешта ўмела прыпаднятае, не чутно было таго пачуцця, якое здольна заражаць другіх, тварыць цуды. Здавалася, чалавек гвалтуе сябе, стараючыся разбудзіць і выклікаць у памяці вобраз, даўно страціўшы ўсякі твар, сцёрты часам. Ён быў заўсёды, усё жыццё далёкі ад чалавека, але зараз ён стаў неабходным яму, у яго чалавек хацеў укласці свае надзеі.

І яны паступова ажыўлялі мерцвяка. Натоўп слухаў уважліва, чалавек выражаў яго жаданні, ён гэта адчуваў. І хоць казачнае ўяўленне сілы яўна не зліва́лася з «яго» вобразам, але ўсе ведалі, што такая сіла ёсць, павінна быць. Прамоўца ажыццявіў яе і істоту, усім вядомую па малюнках у календары, звязаў з вобразам, які ведалі па казках, а ў казках гэты вобраз быў чалавечы. Словы прамоўцы—моцныя, зразумелыя,—зразумела малявалі істоту пануючую, добрую, справядлівую, па-бацькоўску ўважлівую да патрэб народа.

Вера прыходзіла, абдымала людзей, узварушвала іх, заглушаючы ціхі шэпат сумненняў. Людзі спяшаліся паддацца даўно жаданаму настрою, сціскалі адзін аднаго ў вялізны ком аднадушных целаў, і шчыльнасць, блізасць плеч і бакоў саграва́ла сэрцы цеплынёй, упэўненасцю ў поспеху.

— Не трэба нам чырвоных сцягаў!—крычаў лысы чалавек. Размахваючы шапкай, ён ішоў уперадзе натоўпа, і яго голы чэрап цмяна блішчэў, калыхаўся ў вачах людзей, прыцягваючы да сябе іх уважлівасць.

— Мы да бацькі ідзем!..

— Не пакрыўдзіць!..

— Чырвоны колер—колер нашай крыві, таварышы!—упарта гучэў над натоўпам адзінокі звонкі голас.

— Няма сілы, якая вызваліла-б народ, апрача сілы самаго народа.

— Не трэба!..

— Смуццяны, чэрці!..

— Айцец Гапон—з крыжам, а ён—са сцягам.

— Малады яшчэ, але-ж туды-ж каб камандаваць!..

Найменш упэўненыя ішлі ў глыбіні натоўпа і адтуль нервова і трывожна крычалі:

— Гані яго, які са сцягам...

Цяпер рухаліся хутка, без хістанняў і з кожным крокам усё глыбей заражалі адзін аднаго адзінствам настрою, хмелем самаашуканства. Толькі што створаны «ён» настойліва будзіў у памяці старыя цені добрых герояў—водгукі казак, чутых у дзяцінстве, і, напаўняючыся жывой сілай жадання людзей, нястрымана рос у іх уяўленні...

Нехта закрычаў:

— «Ён» нас не любіць!..

І напэўна, што маса людзей шчыра верыла ў гэту любоў істоты, толькі што ёю створанай.

Калі натоўп выліўся з вуліцы на бераг ракі і ўбачыў перад сабой даўгую ламаную лінію, загарадзіўшую яму шлях на мост, людзей не спыніла гэта тонкая шэрая загарожа. У фігурах салдат, ясна абмалёваных на блакітна светлым фоне шырокай ракі, не было нічога пагражаючага, яны падскоквалі, грэлі замёрзлыя ногі, махалі рукамі, штурхаючы адзін аднаго. Наперадзе, за ракой, людзі бачылі цёмны будынак,—там чакаў іх «ён»—цар, гаспадар гэтага будынка. Вялікі і магутны, добры і любячы, ён не мог напэўна загадаць сваім салдатам, каб яны не дапускалі да яго народ, які яго любіць і хоча гаварыць з ім аб сваёй пакуце.

Але на многіх тварах з'явілася цень непаразумення і людзі спераду натоўпу крыху зменшылі свой крок. Іншыя азіраліся назад, іншыя адышлі ў бок, і ўсе стараліся паказаць адзін аднаму, што аб салдатах яны ведаюць, гэта не здзіўляе іх. Некаторыя спакойна пазіралі на залатога анёла, які блішчэў высока ў небе над сумнай цытадэллю, іншыя ўсміхаліся. Чыйсьці голас шкадуючы сказаў:

— Холадна салдатам!

— А-л-е...

— А трэба стаяць!

— Салдаты для парадку.

— Спакойна, зважай!

— Ура, салдаты! — крыкнуў нехта.

Афіцэр у жоўтым башлыку на плячах выцягнуў з ножан шаблю і таксама нешта крычаў насустрач натоўпу, махаючы ў паветры сагнутай стужкай сталі. Салдаты сталі нерухома плячо к плячу, адзін да аднаго.

— Чаго гэта яны?—запытала тоўстая жанчына.

Ёй не адказалі. І ўсім неяк адразу стала цяжка ісці.

— Назад!—пачуўся крык афіцэра.

Некалькі чалавек азірнуліся—ззаду іх стаяла шчыльная маса цел, з вуліцы ў яе лілася без конца цёмная рака людзей; натоўп уступаючы яе напору, запаўняў плошчу перад мастом. Некалькі чалавек вышлі наперад і, махаючы белымі хусткамі, пайшлі насустрач афіцэру. Ішлі і крычалі:

— Мы—к гасудару нашаму...

— Зусім спакойна!..

— Назад! Я загадаю страляць!

Калі голас афіцэра даляцеў да натоўпа, ён адказаў гулкім рэхам здзіўлення. Аб тым, што не дапусцяць да «яго», некаторыя з натоўпу гаварылі і раней, але каб сталі страляць у народ, які ідзе да «яго» спакойна, з верай у яго моц і дабрату,—гэта парушала суцэльнасць створанага вобразу. «Ён»—сіла вышэй усякай сілы, і яму няма каго баяцца, яму няма патрэбы адпіхаць свой народ штыкамі і кулямі.

Худы, высокі чалавек з галодным тварам і чорнымі вачыма раптам закрычаў:

— Страляць? Не павінен!..

І звяртаючыся да натоўпа, моцна сярдзіта гаварыў далей:

— Што? Казаў я—што не пусцяць яны...

— Хто? Салдаты?

— Не салдаты, а—там...

Ён махнуў рукой кудысьці далёка.

— Вышэй якія... Ага! Я-ж казаў!

— Гэта яшчэ невядома...

— Даведаюцца, дзеля чаго ідзем—пусцяць!..

Шум рос. Былі чутны злыя крыкі, выклікі іроніі. Здаровы сэнс разбіўся аб недарэчнасць перашкоды і маўчаў. Рух людзей зрабіўся нервовым, мітуслівым: ад ракі дзьмула вострым холадам. Нерухома блішчэлі канцы штыхоў.

Перакідваючыся воклічамі і паддаючыся напору ззаду, людзі рухаліся наперад. Тыя, якія пайшлі з хусткамі, звярнулі ў бок і зніклі ў натоўпе, але спераду ўсе—мужчыны, жанчыны, падлеткі,—таксама махалі белымі хусткамі.

— Якая там страляніна? Навошта?—сур'ёзна казаў пажылы чалавек з сівой барадой.—Проста яны не пускаюць на мост, моў,—ідзеце проста па ільду..

І раптам у паветры нешта няроўна і суха прасыпалася, пахіснулася, ударыла ў натоўп дзесяткамі нябачаных бізуноў. На секунду ўсе галасы як быццам замерлі. Маса, як і раней, ціха рушылася наперад.

— Халастымі...—не то сказаў, не то спытаў бясколерны голас.

Але тут і там чуліся стогны, ля ног натоўпа лягло некалькі цел. Жанчына, моцна стогнучы, схапілася рукой за грудзі і хуткімі крокамі пайшла наперад, на штыкі, выцягнутыя насустрач ёй. За ёю кінуліся яшчэ людзі, абхапляючы яе, забягаючы наперад яе.

Зноў трэск залпа. Яшчэ больш моцны, яшчэ больш няроўны. Людзі, што стаялі ля плоту, чулі, як задрыжэлі дошкі,—быццам нечыя нябачаныя зубы кусалі іх. А адна куля ўдарыла ўздоўж, па дошцы плоту і, скінуўшы з яго дробныя трэскі, кінула іх у твары людзей. Людзі клаліся па-двое, па-трое, прысядалі на зямлю, хапаліся за жываты, беглі кудысьці кульгаючы, паўзлі па снягу, і ўсюды на снезе загараліся чырвоныя плямы. Яны распаўзаліся, дыміліся, прыцягваючы да сябе вочы... Натоўп падаўся назад, на момант спыніўся, анямеў, і раптам пачулася дзікае, патрасаючае выццё соцен галасоў. Яно нарадзілася і пацякло ў паветры, безупынна напружанай, дрыжачай, вострай хмарай крыкаў, вострага болю, жаху, пратэсту, сумнага здзіўлення і закліку на дапамогу.

Нахіліўшы голавы, людзі групамі кінуліся наперад падбіраць мёртвых і раненых. Раненыя таксама крычалі, пагражалі кулакамі, усе твары раптам сталі іншымі, і ва ўсіх вачах блішчэла нешта амаль шалёнае. Панікі,—таго агульнага чорнага жаху, які раптам ахапляе людзей, змятае целы, як вецер сухое лісце ў кучу, слепа цягне, гоніць усіх кудысьці ў дзікім віхоры імкнення схавацца,—гэтага не было. Быў жах, палючы, як прамерзлае жалеза, ён ледзяніў сэрцы, сціскаў целы і прымушаў глядзець шырока адкрытымі вачыма на кроў, глытаўшую снег, на акрываўленыя твары, рукі, адзежу, на трупы і страшэнна спакойныя ў трывожнай мітусні жывых. Было едкае абурэнне, маркотна бяссільная злосць, шмат замяшання і шмат дзіўна нерухомых вачэй, панура нахмураных брывей, моцна сціснутых кулакоў, сударажных рухаў і рэзкіх слоў. Але здавалася, што больш за ўсё ў грудзі людзей улілося халоднага, амяртвляючага душу здзіўлення. Бо за некалькі хвілін перад гэтым яны ішлі, ясна бачыўшы перад сабою мэту, перад імі стаяў казачны вобраз, яны любаваліся, закаханыя ў яго і жывілі душы свае вялікімі надзеямі. Два залпы, кроў, трупы, стогны і—усе сталі перад шэрай пустатой, бяссільныя, з разадранымі сэрцамі.

Тупацелі на адным месцы, быццам зблытаныя нечым, чаго не здужалі разадраць; адны моўчкі і заклапочана насілі раненых, падбіралі трупы, іншыя

быццам у сне глядзелі на іх працу, ашаломлена, у дзіўным бяздзеянні. Шмат хто крычаў салдатам словы папрокаў, лаянкі і скаргі, размахвалі рукамі, зімалі шапкі, чамусьці кланяліся, пагражалі якімсьці страшэнным гневам.

Салдаты стаялі нерухома, апусціўшы стрэльбы да нагі, твары ў іх былі таксама нерухомыя, скура на шчоках туга нацягнулася, скулы востра высунуліся.

Здавалася, што ва ўсіх салдат белыя вочы, і змерзліся губы...

У натоўпе нехта крычаў істэрычна моцна:

— Памылка! Памылка вышла, браткі!.. Не за тых прынялі! Не верце... Ідзі, браткі,—трэба растлумачыць!..

— Гапон—здраднік! — галасіў падлетак-хлопчык, лезучы на ліхтар.

— Што, таварышы, бачыце, як сустракаюць вас?

— Пачакай,—гэта памылка! Не можа гэтага быць, ты зразумей!

— Дай дарогу раненаму...

Удвух рабочыя і жанчына вялі высокага худога чалавека; ён быў увесь у снезе, з рукава яго пальто струменіла кроў. Твар яго пасінеў, завастрыўся яшчэ больш і цёмныя губы слаба рухаючыся, шапталі:

— Я казаў, не пусцяць!.. Яны яго хаваюць, што ім—народ!..

— Конніца!

— Уцякай!..

Сцяна салдат пахіснулася і адчынілася, як дзве паловы драўлянай брамы, танцуючы і пырскаючы паміж імі праехалі коні, пачуўся крык афіцэра, над галовамі конніцы ўзвіліся, разразаючы паветра, шаблі, срэбнымі істужкамі бліснулі, замахнуліся ўсе ў адзін бок. Натоўп стаяў і хістаўся, хвалюючыся, чакаючы, не верачы.

Стала ціха.

— Ма-рш!—пачуўся шалёны крык.

Як быццам віхор ударыў ў твар людзей, і зямля быццам абярнулася навокал пад іх нагамі, усе рынуліся бегчы, штурхаючы і перакульваючы адзін другога, пакідаючы раненых, пераскокваючы праз трупы. Цяжкі тупат коней наганяў, салдаты былі, іх коні скакалі праз раненых, мёртвых, бліскучэлі шаблі, крыкі жаху і болю, чамусьці быў чуцен свіст сталі і удар яе аб косці. Крык збітых зліваўся ў гулкі працяжны стогн. А-а-а!..

Салдаты замахваліся шаблямі і апускалі іх на галовы людзей, і ўслед за ўдарам целы іх нахіляліся на бок. Твары ў іх былі чырвоныя, бязвочныя. Іржалі коні, страшэнна вышчарыўшы зубы, махаючы галовамі.

Народ загналі на вуліцы... І зараз-жа, як толькі тупат коней знік, людзі спыніліся задыхаючыся, глядзелі адзін на аднаго, вылупіўшы вочы. На многіх тварах з'явіліся вінаватыя ўсмешкі і нехта засмяяўшыся закрычаў:

— Ну і бег жа я!..

— Тут — уцячэш!.. — адказалі яму.

І раптам з усіх бакоў пасыпаліся воклічы здзіўлення, спалоху, злосці...

— Што-ж гэта, браточкі, а?

— Забойства ідзе, праваслаўныя!

— За што?

— Вось так урад!

— Сякуць, а? Коньмі топчуць...

Недаўменна тапталіся на месцы, дзелячыся адзін з адным сваім абурэннем.

Не разумелі, што трэба рабіць, ніхто не адыходзіў, кожны прыціскаўся да другога, стараючыся знайсці выхад са стракатай блытаніны пачуццяў, глядзелі з трывожнай зацікаўленасцю адзін на другога, больш са здзіўленнем, чым са спалохам; чагосьці чакалі, прыслухоўваліся, азіраліся. Усе былі вельмі прыдушаны і разбіты здзіўленнем, яно ляжала зверху ўсіх пачуццяў, перашкаджала зліцца настрою больш натуральнаму ў гэтыя нечаканыя, бяссэнсава непатрэбныя хвіліны, насычаныя крывёю нявінных...

Малады голас энергічна паклікаў:

— Гэй! Ідзеце падбіраць раненых!

Усе схамянуліся, хутка пайшлі да выхада на раку. А насустрач ім, у вуліцу паўзлі па снягу і ўваходзілі хістаючыся пакалечаныя людзі, у крыві і снезе. Іх бралі на рукі, неслі, затрымлівалі фурманоў, зганялі седакоў, кудысьці адвозілі. Усе сталі заклапочанымі, панурымі, маўклівымі. Разглядалі раненых уважваючымі вачыма, нешта моўчкі параўноўвалі, вымяралі, паглыблена шукалі адказаў на страшнае пытанне, паўстаўшае перад імі невыразным чорным ценем. Ён знішчыў вобраз нядаўна выдуманага героя, цара, крыніцу міласці і дабра. Але не многія адважыліся ўголас сазнацца, што гэты вобраз ужо зруйнаваны. Сазнацца ў гэтым было цяжка—гэта азначала пазбавіць сябе апошняй надзеі..

На здымку: Метэоролог (2 Турктуль, Кара-Калпакская АССР) З. Петрова (злева) і медыцынская сястра Т. Шырокорад здаюць нормы на значок Варашылаўскага стралка. Кіруе стральбой метэоролог Т. Скотнікава.

(Фота-кліше ТАСС).

16/I

# Аб дзіцячай нервовасці

Бацькі і выхавацелі часта скардзяцца на раздражняльнасць дзяцей, на іх капрызы, празмерную ўражлівасць, на няўстойлівасць іх настрою і паводзін. Дзіця то вясёлае і шумнае, то падаўленае, то спакойнае і паслухмянае, то раздражняльнае і ўпартае.

Не гледзячы на добрыя разумовыя здольнасці, нервовыя дзеці не заўсёды паспяхова вучацца ў школе. Гэта тлумачыцца няўстойлівасцю іх увагі і няздольнасцю да працяглай работы. Адным перашкаджае няўпэўненасць у сваіх сілах, баязлівасць, нерашучасць; другім—няўседлівасць, празмерная рухавасць. Дзеці самі часта скардзяцца на павышаную стомленасць, галаўныя болі, страхі.

Нервовае дзіця ўсяго баіцца: цемры, адзіноцтва, чужых людзей. Страхі прымаюць часта незразумелы характар: дзіця пачынае баяцца футры, павуціны, замкнутых дзвярэй, адкрытай плошчы і т. д. Спіць яно чутка і трывожна, бачыць страшныя сны, часта ўскрыквае (часта бываюць начныя страхі і т. д.)

Апетыт у нервовых дзяцей звычайна дрэнны: вялікая пераборлівасць у ядзе, нярэдка нанос, ваніты без якіх-небудзь прычын. У некаторых нервовых дзяцей нервовасць праяўляецца ў заіканні, падзёргванні, непрытомнасці, начным нетрыманні мачы, ананізме і іншае.

Прычыны дзіцячай нервовасці празмерна рознастайныя. Сярод іх вялікае месца займаюць памылкі выхавання. Усім добра вядома, як шкодна дзейнічае на дзіця празмерна суровае выхаванне. Пад уплывам пакаранняў і пагроз дзіця робіцца хмурым, панурым, азлобленым, ён нікому не давярае, да ўсіх адносіцца адмоўна. «Усе людзі нядобрыя, злосныя, я лепш буду дружыць з сабакай»,—гаварыў хлопчык 8 год, якога заўсёды лаялі, каралі, часамі білі. У другіх дзяцей цяжкія перажыванні праяўляюцца не столькі ў дрэнным настроі, колькі ў парушэнні дысцыпліны, у лішняй рухавасці, у грубых свавольствах, упартасці, азлобленасці, часамі ў нахіле да ўцёкаў з дому і крадзяжы.

Вялікае значэнне мае прыклад бацькоў. Грубасць і нястрыманасць дарослых у абыходжанні адзін з другім бывае часта галоўнай прычынай няправільных паводзін дзіцяці. Нярэдка дзеці, вельмі прывязаныя да бацькі і мацеры, хваравіта перажываюць іх спрэчкі, знаходзяцца ў стане пастаяннай трывогі. Яны робяцца палахлівымі і плаксівымі, у старшых дзяцей парушаецца работаздольнасць, яны скардзяцца на стомленасць і галаўныя болі.

Але не толькі суровае выхаванне робіць дзіця нервовым. Не меншы, а магчыма нават большы ўплыў на развіццё дзіцячай нервовасці мае лішняя клапатлівасць у адносінах да яго.

Празмерная ўвага і пяшчоты, робячыя з дзіцяці хатняга кумірa, перш за ўсё дрэнна ўплываюць на яго характар. Ён робіцца халодным, самаўлюбёным эгаістам, патрабуючым пастаяннай увагі да сябе. Усякія спробы паменшыць гэту ўвагу выклікаюць у дзіцяці адзнакі павышанай нервовасці. Пры нараджэнні другога дзіцяці ў сям'і гэта ўласцівасць набывае характар рэўнасці.

— Навошта ён у нас, я закапаю яго ў ямку,—гаварыла дзяўчынка 4 год і пачынала плакаць, калі маленькага брата ласкалі ў яе прысутнасці.

Празмерная ўвага, якая ўдзяляецца дзіцяці ў часе прыёму стравы—угаворы і абяцанні, ласкі і пагрозы—стварае ў яго адмоўныя адносіны да ежы. Размовы ў прысутнасці яго аб дрэнным апетыце, пастаяннае падкрэсліванне, што яно асаблівае дзіця, яшчэ больш замацоўваюць у яго нежаданне есці. Дзіця, зразумеўшы аднойчы, што адмовамі ад ежы яно прыцягвае да сябе ўвагу бацькоў, пачынае ўсімі спосабамі знарок дабівацца гэтай увагі. Ваніты, таксама як і адмаўленне ад ежы, часта скарыстоўваюцца дзіцем як пратэст і спосаб прыцягнення да сябе ўвагі дарослых. Перамена абстаноўкі, прыём стравы ў дзіцячым калектыве, дзе дарослыя мала звяртаюць увагі на самую працэдуру ежы,—вось правільны спосаб хутка знішчыць такія з'явы.

Вельмі дрэнна дзейнічаюць на дзіця пастаянныя размовы пры ім аб хваробах. Гэта сканцэнтроўвае яго ўвагу на сваіх уласных адчуваннях, робіць яго трывожным, мніцельным, «маленькім дзядочкам».

Шкодна таксама захвальваць дзіця ў яго прысутнасці. Дзіця робіцца выхвальным, празмерна самалюбівым.

Калі мы ўлічым, які адмоўны ўплыў на развіццё дзіцячай нервовасці аказваюць памылкі выхавання, то нам стануць яснымі і меры папярэджання. Кожнае дзіця патрабуе клопатаў і ўвагі. Адсутнасць пяшчотнасці, залішняя строгасць і пакаранні перашкаджаюць правільнаму развіццю асобе дзіцяці і часта робяць яго нервовым. У той-жа час празмерная пяшчотнасць, беспярэчнае выкананне жаданняў дзіцяці прыносяць яму толькі шкоду.

Правільна выхаваць дзіця—гэта значыць выпрацаваць у ім стрыманасць і разам з гэтым жыццерадаснасць, бадзёрасць, упэўненасць у сваіх сілах. Для правільнага разумовага развіцця надзвычайна важна прадаставіць дзіцяці пасільны для яго ўзросту адукацыйны матэрыял. Не трэба празмерна паскараць развіццё дзяцей пастаяннымі размовамі, спевамі і расказамі, не адпавядаючымі іх узросту. Важна пазбегнуць перагрузкі нервовай сістэмы дзіцяці ўзбуджальнымі ўражаннямі, страшнымі расказамі, празмерна частымі наведваннямі кіно і тэатраў.

Вялікая ўвага павінна быць удзелена загартоўванню дзіця... як фізічнаму, так і псіхічнаму. Тут мае вялікае значэнне фізкультура, гульні, гімнастыка, умераны спорт, правільнае харчаванне, дастатковы сон і, галоўнае, навыкі да працы, выхаванне ў калектыве, якія даюць дзіцяці магчымасць перажыць радасць творчай работы і развіваюць вынослівасць і грамадскія навыкі.

**Праф. Г. Е. Сухарэва.**

(„Общественница")

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 49, 1 паверх.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 2005. Тыраж 12.000 экз. Уп. Галоўліта БССР № 29.
Здана ў друк. 3/I—40 г. Падпісана да друку 17/I—40 г. У нумары 2½ друк. арк. 120×140 друк. знак.

ЦАНА 20 кап.

Да гэтага нумару бясплатна дадаецца ўкладка-выкрайка.

Новагодні бал калектываў станкабудаўнічых заводаў імені Варашылава і імені Кірава ў клубе металістаў (Мінск).

Фота Л. Мазелева і В. Грунтфеста.